# УВОДЗІНЫ

Навучыць дзяцей правільнаму, бегламу, усвядомленаму, выразнаму чытанню — адна з галоўных задач пачатковай адукацыі. Але ў апошні час усё больш бацькоў сутыкаюцца з тым, што іх дзеці чытаюць вельмі марудна. А менавіта ад гэтага важнага комплекснага навыку залежаць іх поспехі ў навучанні. Як дапамагчы дзецям? Для павелічэння хуткасці чытання існуе шмат эфектыўных і цікавых прыёмаў.

Вашай увазе прадстаўлена выданне, якое змяшчае не толькі творы для пазакласнага чытання, рэкамендаваныя праграмай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, але і эфектыўныя практыкаванні, накіраваныя на павелічэнне хуткасці чытання, на развіццё ўсвядомленасці, увагі і памяці, чытацкай самастойнасці.

Матэрыял складаецца з 10 раздзелаў, прысвечаных асобнай тэме, яго можна выкарыстоўваць на ўроках пазакласнага чытання для арганізацыі індывідуальнай, парнай, групавой або франтальнай работы з навучэнцамі. Яго могуць паспяхова ўжываць бацькі трэцякласнікаў для заняткаў з дзецьмі дома. Праца з выданнем зробіць навучанне хуткаму чытанню цікавым і займальным.

Практыкаванні, якія спрыяюць фарміраванню навыку хуткага чытання ў малодшых школьнікаў:

| Практыкаванне | Каштоўнасць |
|---|---|
| 1. «Прама і наадварот» | Развіццё памяці, фармаванне эталонаў цэласных літар незалежна ад таго, як яны размешчаны. |
| 2. «Чытанне пад вуглом 90 градусаў» | Развіццё міжпаўшарнага ўзаемадзеяння, мыслення, увагі, здольнасці канцэнтравацца.<br>Мэта — дамагчыся, каб хуткасць чытання ў прамым і зваротным парадку зраўнялася. |
| 3. «Чытанне пад вуглом 180 градусаў» | Развіццё міжпаўшарнага ўзаемадзеяння, мыслення, увагі, здольнасці канцэнтравацца.<br>Мэта — дамагчыся, каб хуткасць чытання ў прамым і зваротным парадку зраўнялася. |
| 4. «Розны шрыфт» | Спрыяе паспяховай барацьбе з рэгрэсіяй вачэй. Новы шрыфт у кожным радку аўтаматычна спыняе погляд чытача. |
| 5. «Прапушчаныя літары» | Актывізацыя па чарзе абодвух паўшар'яў галаўнога мозгу. Развіццё славесна-лагічнай памяці, сэнсавай здагадкі. Ліквідацыя такіх перашкод хуткага чытання, як рэгрэсія вачэй і артыкуляцыя. Спрыяе хуткаму распазнаванню слова ў тэксце. |
| 6. «Зашыфраваныя словы» | Нестандартная падача слоў у тэксце, па-першае, дэманструе механізм чытання, паказвае рэзервы хуткасці, чым вышэй хуткасць чытання, тым вышэй разуменне, па-другое, трэніруе мозг апярэджваць тэкст, па-трэцяе, дазваляе хутчэй успрымаць візуальную інфармацыю, што вельмі карысна для паскарэння чытання. |
| 7. «Пераблытаныя літары» | Спрыяе фарміраванню навыку сэнсавай здагадкі, вучыць пазнаваць тэкст, развівае ўвагу. |

| Практыкаванне | Каштоўнасць |
|---|---|
| 8. «Бурбалкі» | Трэніруе ўвагу, вучыць успрымаць слова цалкам, а не асобныя літары, цікавіць сваёй незвычайнасцю, падымае настрой і стварае станоўчую матывацыю да чытання. |
| 9. «Выпадковыя сімвалы» | Спрыяе хуткаму распазнаванню слова цалкам у тэксце, фарміраванню навыкаў асэнсаванага чытання і разумення прачытанага. |
| 10. «Знакі прыпынку» | Дапамагае развіваць навыкі асэнсаванага выразнага чытання і правапісу. |

**Кожныя 15 хвілін неабходна выконваць гімнастыку для вачэй:**

1) кругавыя кручэнні вачыма, не закрываючы іх, па 4 разы спачатку ў адзін бок, потым — у другі;

2) злёгку націскаць на закрытыя вочы;

3) зафіксаваць погляд на кончыку пальца, набліжаць палец да носа і аддаляць на адлегласць выцягнутай рукі, утрымліваючы погляд на пальцы.

Да кожнага тэксту даюцца пытанні для праверкі ўсвядомленасці чытання ці практычныя заданні, накіраваныя на замацаванне набытых навыкаў, паляпшэнне канцэнтрацыі ўвагі, памяці, кемлівасці, здольнасці вылучаць патрэбную інфармацыю, даказваць свой пункт гледжання, што падымае настрой і стварае станоўчую матывацыю да чытання.

# ПРЫГОЖАЯ ПТУШКА ПЕР’ЕМ, А ЧАЛАВЕК — ВУЧЭННЕМ

Практыкаванне № 1 **«Прама і наадварот».** Чытай тэксты як звычайна, а выдзеленыя словы і сказы чытай справа налева.

## МАЯ БІБЛІЯТЭКА

Я ніколі не сумую —
**.юурбяс імагінк з анцоМ**

Рады вам я пахваліцца,
**.ыцілап ырт хі еням ў отШ**
Ёсць Купала, Багдановіч,
**,чабоп акўорБ ,актёЦ ,салоК**
Караткевіч, Маўр, Лынькоў,
**.ўоклахіМ ,нівшырП ,нікшуП**
Ёсць Маршак, Біянкі, Волкаў,
**.ніклоТ ,ырадаР ,невТ ,нэргдніЛ**

Ёсць і казкі ўсіх народаў,
**.ыдогырп ,акытсатнаф ьцсЁ**
На паліцах кніг палова
**.хывокуван-аньлаванзаП**
І калі часінку маю —
**,юатыч юадоласа З**

І сярод сяброў маіх
**.гінк хытэг ўяорег тамШ**
Дзень надарыцца няўдачны —
**,учалп ен і юудяб еН**
Супакой мой не ў аптэцы,
**.ыцэтяілбіб йёам ў А**

*(М. Пазнякоў)* [7]

Знайдзі і падкрэслі на старонцы ўсе словы, якія пачынаюцца на літару Н.

# ЗІМОВЫ ДЗЯНЁК, ШТО КАМАРОЎ НАСОК

Практыкаванне № 5 **«Прапушчаныя літары».** Чытай тэксты, запаўняючы пропускі літар у думках.

## ЗІМА

### 1

Надышлі мар...зы,
Р...чкі закав...лі,
Б...лыя бяр...зы
Шэранем убралі.

Зам...лі дар...гі
В...трыкі сн...гамі.
Лес, як дз...д убогі
З до...гімі вус...мі,

Апусціў гал...ны
І стаіць журб...тна,
Зр...дку верхавіны
Зашум...ць маркотна.

### 2

М...ккая пяр...на
В...чы адбірае.
Б...лая раўніна —
Ні к...нца, ні кр...ю.

Пад п...лёнкай б...лай
Тр...вы і ліст...чкі.
Р...чка ан...мела,
Зм...ўклі руча...чкі.

Ам...рцвелі лозы,
Ч...ць галлём хістаюць,
А ў пал...х мар...зы
Ды в...тры гул...юць.

*(Я. Колас)* [12]

Перакажы верш прозай.

# МІРНА ЖЫЦЬ — ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ

Практыкаванне № 10 **«Знакі прыпынку».** Чытай тэксты, выконваючы знакі прыпынку.

## *Не трэба вайны*

*(ўрывак)*



*...*
*Мы дзеці вялікай і мужнай зямлі,*
*Мы з думай аб міры і шчасці ўзраслі,*
*Мы хочам зямлю дагледзець, засяваць,*
*Мы хочам свае гарады будаваць,*

*Мы хочам, каб кожны ў радасці жыў,*
*Каб кожны дзяцей гадаваў і вучыў,*
*Мы клічам на свеце з'яднацца сяброй,*
*Каб полымя бойкі не ўспыхнула зноў.*

*Таварыш!*
*Сягоння ў нас думы адны:*
*Мір нам патрэбен,*
*Не трэба вайны!*

*(П. Броўка)* [2]

Падкрэслі важныя, на твой погляд, радкі ў вершы. Растлумач свой выбар.

# ЗМЕСТ


*Уводзіны* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

**ПРЫГОЖАЯ ПТУШКА ПЕР'ЕМ, А ЧАЛАВЕК — ВУЧЭННЕМ** . . . 3

**Практыкаванне № 1 «Прама і наадварот»**

Мая бібліятэка *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Коска *(В. Хомчанка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**УВОСЕНЬ І ВЕРАБЕЙ БАГАТЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**Практыкаванне № 2 «Чытанне пад вуглом 90 градусаў»**

Восень *(Я. Колас)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

Чаму птушкі адлятаюць *(Цётка)* . . . . . . . . . . . . . . . 7

**ЧАЛАВЕК БЕЗ РАДЗІМЫ, ШТО САЛАВЕЙ БЕЗ ПЕСНІ** . . . . . 8

**Практыкаванне № 3 «Чытанне пад вуглом 180 градусаў»**

У родным краі *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . 8

Родныя назвы *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . 8

Родная зямля *(У. Караткевіч)* . . . . . . . . . . . . . . . . 9

**ДОБРЫ ЧАЛАВЕК І ЖЫВЁЛУ ШКАДУЕ** . . . . . . . . . . . . 10

**Практыкаванне № 4 «Розны шрыфт»**

Пра зязюлю *(беларускае народнае паданне)* . . . . . . . . . 10

Ластаўчыны дзеткі *(Я. Пархута)* . . . . . . . . . . . . . . 11

**ЗІМОВЫ ДЗЯНЁК, ШТО КАМАРОЎ НАСОК** . . . . . . . . . . 13

**Практыкаванне № 5 «Прапушчаныя літары»**

Зіма *(Я. Колас)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

Першы снег *(Я. Колас)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Хто як зімуе *(Г. Аўласенка)* . . . . . . . . . . . . . . . . 15

**ЯК ТЫ ДА ЛЮДЗЕЙ, ТАК І ЛЮДЗІ ДА ЦЯБЕ** . . . . . . . . . 17

**Практыкаванне № 6 «Зашыфраваныя словы»**

Як мухаморы вайну пачыналі *(Г. Аўласенка)* . . . . . . . . . 17

Людзей слухай, а свой розум май *(беларуская народная казка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

**ДОБРАЕ ДЗІЦЯ БАЦЬКОЎ ДУМКІ ЗГАДВАЕ** . . . . . . . . . . . . . . . 21

**Практыкаванне № 7 «Пераблытаныя літары»**

Каток — залаты лабок *(беларуская народная казка)* . . . . . . . . 21

Шчасце *(Я. Маўр)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23

**ВЯСЕННІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

**Практыкаванне № 8 «Бурбалкі»**

Вялікдзень *(В. Вітка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

Белыя вішні і яблыні *(І. Мележ)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

**ХТО ХОЧА ШЧАСЛІВА ЖЫЦЬ, ТОЙ ПРАЦУ ПАВІНЕН ЛЮБІЦЬ** 28

**Практыкаванне № 9 «Выпадковыя сімвалы»**

Хто што робіць *(В. Вітка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

Цясляр-самахвал *(беларуская народная казка)* . . . . . . . . . . . 29

**МІРНА ЖЫЦЬ — ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ** . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

**Практыкаванне № 10 «Знакі прыпынку»**

Не трэба вайны *(П. Броўка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

Самае моцнае слова ў свеце *(склад. А. І. Гурскі)* . . . . . . . . 34

ЧЫТАЦКІЯ ЎМЕННІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37